# Аксаміт

*«А хмаркі ў фарбах златалітых,*
*Ў шаўках агністых,* ***аксамітах****,*
*То паасобку, то гурткамі,*
*То залатымі ланцужкамі,*
*Як бы спыніўшысь нерухліва,*
*Усмешкі кідаюць шчасліва, —*
*І ім хацелася, відаць,*
*Святы Вялікаднік вітаць.»*

“Новая зямля”

– шаўковая тканіна з кароткім густым ворсам (руск. – бархат)

# Басэтля

«Граў на скрыпачцы камар,
На дудачцы – чмель-дудар,
Хрушч узяў **басэтлю**,
Задае там пытлю.»

“Рак-вусач”

– беларускі народны смычковы музычны інструмент нізкага гучання, кантрабас

# Задаць пытлю

– праявіць сябе ў поўную сілу

# Выцінаць

*«Авадзень на леры*
***Выцінаў** без меры,*
*А чырвоны конік*
*Жарыў у гармонік.»*

“Рак-вусач”

– старанна выводзіць якую-небудзь мелодыю, гук

# Драпянка

“Хадзіў коцік пад масток,
Лавіў рыбку за хвасток,
Потым дзеду ён на печы
Казкі-байкі варкаваў,
Белым хвосцікам дарэчы
Тахты спевам адбіваў...
Ну, такі каток харошы,
Як **драпянка** за тры грошы!”

“Савось-распуснік”

– адзежына з грубай, шурпатай тканіны

# Каралі

«А па купінах,
Каля пнёў, лам’я
Чырвань спелая,
Тых суніц сям’я,
Нібы ўсыпана
Тут **каралямі**,
І глядзяць яны
Кралі-кралямі —
Сакавітыя,
Як налітыя,
Ды ўсе ладныя,
Ды панадныя.»

“Міхасёвы прыгоды”

– упрыгожанне з каралавых або іншых каштоўных камянёў, якое надзяваецца на шыю

# Панадны

- такі, што прыцягвае да сябе якімі-небудзь якасцямі; прыемны, прывабны

# Трупцець

«Але тут сёстры сердавалі
І залаб Юзіка цягалі.
Тады іх згода прападала,
Між імі бойка вынікала.
Пускаў тут Юзік лыжку ў дзела;
Не раз лабаціна **трупцела**
Ў сястрычак Гэлі ці Ганулі.»

"Новая зямля"

– утварацць глухі нячысты гук

# Утнуць

(уцяць)

«Грай, дударыку, грай,
А ты, муха, выцінай!
Грай на скрыпцы, сляпень,
На басэтлі, авадзень!
Чмель, у бубен бубні!
Шэршань, песню **утні!**
Я хачу паскакаць,
Ўсіх на баль пасклікаць.»

"Новая зямля"

– пачаць іграць на якім-небудзь музычным інструменце

# Як Піліп з канапель

«Выскачыў журавель,
**Як Піліп з канапель,**
Напалохаў жабку,
Адтаптаў ёй лапку.
Пайшлі ў скокі сотні пар,
А за імі і камар
Бусла спрытна падхапіў,
Буслу ногу зачапіў,
На мазоль наступіў.»

“Рак-вусач”

– раптоўна, знянацку (выскачыць адкуль-небудзь, з’явіцца дзе-небудзь)

# Мяльнуць

*“Рыбкі хвосцікам **мяльнуць***
*Ды галоўкамі кіўнуць.*
*І хутчэй наўцекача*
*Ад рачышчы-вусача.”*

“Рак-вусач”

– павярнуць з боку ў бок, махнуць

# Снавацца

“Сядзе хлопчык над крынічкай
І не зварухнецца,
Пазірае, як над дзічкай
Пташачка **снуецца**
І сваіх маленькіх дзетак
Корміць чарвячкамі.
Эх, як слаўна сярод кветак
Летнімі дзянькамі!..”

“У полі”

- рухацца ў розных кірунках, туды і сюды

# Разгаты

“Пад карэннямі ракіты
Жыў-быў рак, вусач сярдзіты...
З доўгімі вусішчамі,
З чорнымі вачышчамі,
Зыркімі, лупатымі,
З лапамі **разгатымі,**
Шырачэзны ў шыі,
Клешні – во якія!”

“Рак-вусач”

– з растаўленымі ў бакі галінамі, развілінамі

# Улонне

«Доктар дзіцячы
Лячэнне прызначыў —
Адправіць Міхася на вёску.
Паветрам гаючым
І сонцам бліскучым
Міхасевы сілы ўзмацніць.
На **ўлонні** прыроды
Такія прыгоды,
Што ў горадзе нельга й сасніць.»

“Міхасёвы прыгоды”

– паверхня ці нетры вады, зямлі

# Смуга

*“Патускнела яснасць дзён,*
*Хмары сцелюцца, як лён,*
*Ды звісаюць нізка.*
*Залягае, як туга,*
*На твар далечы* ***смуга*** *—*
*Восень блізка, блізка.*
*Ужо шле яна паслоў*
*Па гусей і па буслоў —*
*Час ім, час у вырай!”*

“Міхасёвы прыгоды”

- лёгкая, падобная на дым атмасферная пялёнка, дымка, туман

# Кузурка

Ўгары над хвойнікам зялёным
Снуюцца пчолкі з ціхім звонам,
**Кузуркі** розныя і мушкі
Свае спраўляюць гулі-гушкі
І так танюсенька гудуць,
Што ледзьве-ледзьве можна ўчуць.

"Новая зямля"

– усякае маленькае насякомае

# Халепа

«**Халепа** страшная была, секла, ды яшчэ з ветрам»

- «мокрае» надвор’е, снег з дажджом

# Блазан (блазніцы)

*«Важна сеў Міхась на пні*
*Між бярозак у цяні,*
*А суніцы, як **блазніцы**,*
*Сталі хлопца спакушаць,*
*Араматамі дышаць...»*

“Міхасёвы прыгоды”

- той, хто сваімі паводзінамі
  любіць пацяшаць другіх

# Багна

«А ноч ціхутка; ў **багне** цёмнай
Пустэлі страшнай і бязмоўнай
Гарацъ дрыготна, ззяюць зоркі,
Як найдарожшыя пацёркі,
То паасобку, то гурткамі,
То брыльянцістымі радкамі»

“Новая зямля”

– нізкае топкае месца, грузкае балота; дрыгва

# Ганіць

«Шэршань барабаніць,
Камарыка **ганіць**:
«Пайшоў вон! Пайшоў вон!
Ты не гэты бярэш тон!»

“Рак-вусач”

– прызнаваць непрыгодным, кепскім; даваць нізкую ацэнку

# Дзякуй за ўдзел!